




# Духоўнае адраджэнне

У рэдакцыю раённай газеты "Шлях Кастрычніка" звярнулася з пісьмом жыхарка вёскі Юзяфоўка Бяседавіцкага сельсавета Марыя Пятроўна Храмянкова. Яна веруючая, з'яўляецца прыхажанкай Свята-Троіцкага сабору, што ў Хоцімску.

Вось што яна паведамляе: "Прашу падрабязней расказаць аб гэтым храме і аб настаяцелі данай царквы архімандрыце Кірылу. Ён многае зрабіў па адраджэнні сабору, ператварыў яго ў азораны. Айцец Кірыл стараецца ва блага Спасіцеля нашага і для нас і нашых нашчадкаў. У гэтым дзеянні Гасподнім яму патрэбна і дапамога. І нам неабходна яго падтрымліваць".

Не так даўно па заданню рэдакцыі я пабываў у храме, сустрэўся з свяшчэннікам айцом Кірылам, у міру Аляксеем Пятровічам Бадзічам. Выслухаў яго аповед. Варта адзначыць, што Свята-Троіцкаму сабору прэса, электронныя сродкі массавай інфармацыі ўдзяляюць немалую ўвагу. Пісала аб ім і аб свяшчэнніку і наша раёнка.

Зразумела, што хоцімская зямля славіцца сваім храмам і не менш – яго служыцем, архімандрытам Кірылам. Гэтыя дзве крыніцы і дзве састаўныя часткі садзейнічаюць умацаванню ў нашым краі праваслаўнай веры, у вялікай ступені – няпростаму працэсу адраджэння духоўнасці.

А Свята-Троіцкая царква, якая па ўсіх старадаўніх традыцыях узвышаецца ў цэнтры Хоцімска, сапраўды дыхтоўная і велічная. Калі ўзводзілі гэты храм на сродкі купецтва і земства ў гонар адмены прыгоннага права на Русі, задумалі зрабіць яго правобразам сталічнага храма Хрыста Спасіцеля. Ды не хапала сродкаў для такога размаху. Таму і атрымаўся ён паменшанай копіяй. Аднак па прыгажосці і велічы нічым не ўступае "арыгіналу". І нават лёсам сходжыя. У часы бязбожжа маскоўская святыня была знішчана. У Хоцімску ж Свята-Троіцкі сабор, знёсшы свяшчэннаслужыцеля мара адрадзіць першапачатковы воблік сабору. Мара, якой, толькі дзякуючы падвіжніцтву айца Кірыла, суджана было збыцца. Якім чынам – размова асобная, працяглая і празаічная. Аднак тое, што святая вера і бескарыслівасць прынеслі пастыру аўтарытэт і павагу,- доказаў не патрабуе. Айцец Кірыл не абдзелены і царкоўнымі ўзнагародамі: ордэнам князя Уладзіміра другой ступені, медалём прападобнага Сергія Раданежскага другой ступені.

Не засталася незаўважанай дзейнасць архімандрыта Кірылы і кіраўніцтвам Рэспублікі Беларусь. Ён удастоены Дыплома, медаля і прэміі "За духоўнае адраджэнне". І ўсё гэта за актыўную падвіжніцкую дзейнасць у гуманітарнай галіне, накіраваную на развіццё прагрэсіўных мастацка-духоўных традыцый, якія садзейнічаюць умацаванню дружбы і братэрства паміж людзьмі.

Але вышэйшай узнагародай айцец Кірыл лічыць людскую адметнасць – прызнанне паствы. Прыхаджане глыбока вераць у дзейнасць архімандрыта. Яго жыццё і падвіжніцтва выклікаюць і ў іх, і ў атэістаў зачараванне, таму што даюць прыклад дабра, працалюбства, вернасці справе і мэтанакіраванасці ў рабоце.

Мізэрныя сродкі, сабраныя парафіянамі на ўзнаўленне храма, зразумела ж, былі недастатковыя для выканання такога аб'ёму работ. Аднак яны папаўняюцца і цяпер. Ахвяроўваюць на царкву не толькі асобныя вернікі, а і цэлыя калектывы, раённыя ўлады.

Наведмаемасць храма добрая. Богаслужэнне праходзіць пяць разоў на тыдзень. Існуе царкоўны хор, у якім налічваецца трынаццаць чалавек. Пабудавана царкоўна-прыхадская школа, якую наведваюць звыш сямідзесяці хлопчыкаў і дзяўчынак розных узростаў. Пры школе ёсць бібліятэка, кіназала, дзе дэманструюцца мастацкія фільмы і ленты на царкоў-

прыслалі ў падарунак Зарэцкія з Мінску навейшай маркі тэлевізар і ўсю апаратуру да яго. Папаўняецца і бібліятэка. Зараз у ёй ужо налічваецца каля трох тысяч экземпляраў кніг на самыя разнастайныя тэмы.

Абучае музыцы дзяцей работніца Хоцімскай дзіцячай школы мастацтваў Н.П. Пыткіна. Сама яна займаецца ў Маскоўскім Універсітэце.

Пры школе створаны разнастайныя гурткі.

Былі планы ў свяшчэнніка вярнуць храму галоўны колакал, зняты яшчэ да вайны. Ды грошай на яго адліўку і дастаўку не хапала. Звярнуўся айцец Кірыл да прыхаджан, кіраўніцтва раёна, работнікаў устаноў, арганізацый, прадпрыемстваў, сельскай гаспадаркі за дапамогай. У час праходжання злёту перадавікоў народнай гаспадаркі раёна многія з удзельнікаў ахвяравалі свае прэміі на добрую справу. Зараз у саборы сабраны поўны камплект колакалаў. Самы буйны з іх вагой у сто пудоў. І звоняць цяпер яны, радуючы слых хацімчан.

Убранне ўнутры храма не падлягае апісанню. Аб гэтым кораткa не скажаш – лепш самому пабачыць такую прыгажосць, наведваючы сабор.

Клапоцячыся не толькі аб убранні храма, аб утрыманні службы ў ім, а і аб знешняй эстэтыцы, як сапраўдны кветкавод, настаяцель айцец Кірыл, на прылягаючй тэрыторыі зрабіў клумбы і кветнікі. Так што ў летні час абіцель патанае ў зямной прыгажосці, рудуючы і дзіўляючы погляд прыхаджан.

У Хоцімску ў Свята-Троіцкім саборы архімандрыт Кірыл працуе з 1958 года. У свой час Аляксей Пятровіч Бадзіч знаходзіўся ў радах Савецкай Арміі. Служыў нават у Карэі. Мае ўрадавыя ўзнагароды. Яго вайсковае званне – старшына.



**На здымках:** архімандрыт Кірыл ( у цэнтры) заўсёды рады, калі Свята-Троіцкі сабор наведваюць дзеці; камп'ютэрны клас у царкоўна-прыхадской школе.

**Фота Святланы БАБРОВАЙ.**

купалы, ператварылі ў склад гаспадарчых тавараў, а з цягам часу тут дзейнічаў раённы Дом культуры.

Менавіта ў такім выглядзе і ўбачыў храм накіраваны ў мясцовы прыход для вядзення службы свяшчэннік Кірыл, выпускнік Мінскай духоўнай семінарыі. І менавіта ў той час пасялілася ў душы

ныя тэмы. І.І. Кажамяка, былы старшыня райвыканкама, падарыў школьнікам царквы дзесяць камп'ютэраў, два піяніна. Дзеці пастаянна бываюць на экскурсіях, якія арганізоўваюцца ў храме, наведваюць святыя мясціны ў Маскве, Полацку, Смаленску, Жыровічах і інш.

Царкоўна-прыхадской школе

Вера цвёрдасцю моцная. Служэнню ёй, адраджэнню духоўнасці і прысвяціў сваё жыццё А.П. Бадзіч, хоцімскі архімандрыт Кірыл. І яго падвіжніцтва заслужыла і заслугоўвае высокай ацэнкі не толькі прыхаджан, а і нашай дзяржавы.

Няхай свеціцца імя яго.

**Іван ЦІТОЎ.**

**Цітоў, І. Духоўнае адраджэнне :** аб Свята-Троіцкім храме і яго настаяцеле, архімандрыце Кірылле / Іван Цітоў // Шлях Кастрычніка. — 2006. — 29 ліпеня. — С. 2.